ЗА СВАБОДНАЕ ВЕРАВЫЗНАННЕ

Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь

№25 студзень — сакавік 2010

«... абяцаем тое сабе сумесна за нас і за патомкаў нашых на векі вечныя пад абавязкам прысягі, пад вераю, гонарам і сумленнем нашым, што мы, якія з'яўляемся рознымі ў веры, мір паміж сабой захоўваць, а ў сувязі з розніцай веры і адрозненнем у цэрквах крыві не праліваць і не караць адсуджэннем маёмасці, пазбаўленнем гонару, турэмным зняволеннем і выгнаннем, і ніякаму вяршэнству, ані ўраду, да такога ўчынка ніякім чынам не дапамагаць...»

Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588. Гл.3, арт.3.

Иван Михайлов: вера и принцип



В этом выпуске мы публикуем документы по уголовному делу Ивана Михайлова. Иван Михайлов — прихожанин еврейско-мессианской общины «Новый завет» отказался от прохождения срочной воинской службы, поскольку это противоречило его религиозным убеждениям, и просил назначения ему гражданской (альтернативной) службы в соответствии со ст.57 Конституции Республики Беларусь. Просьбы Ивана Михайлова не были услышаны соответствующими государственными органами, и 15 декабря 2009 года он был арестован и помещен в следственный изолятор. Против верующего возбуждено уголовное дело за «уклонение от мероприятий призыва на воинскую службу» по ст. 435 УК РБ, предусматривающей максимальное наказание в виде лишения свободы сроком на два года.

1 февраля 20010 года Минский районный суд признал И. Михайлова виновным в совершении уголовного преступления за уклонение от мероприятий призыва на воинскую службу и на основании ч. 1 ст. 435 УК РБ приговорил его к трем месяцам ареста.

9 марта 2010 судебная коллегия по уголовным делам Минского областного суда рассмотрела кассационную жалобу Михайлова на приговор, вынесенный ему судом Минского района, и решила направить дело на повторное рассмотрение. Кроме того, коллегия постановила освободить Михайлова, изменив ему меру пресечения с содержания под стражей на подписку о невыезде.

Гражданская инициатива «За свабодное вероисповедание» выражает свою солидарность с позицией Ивана Михайлова. Мы будем следить за рассмотрением этого дела и в ближайшем номере проинформируем о его результатах. Копию решения Верховного Суда по данному делу **см. на странице 5.**

«За свабоднае веравызнанне»

Правозащитник Дина Шавцова об изменениях части 1 статьи 9.9 Кодекса Республики Беларусь об административных правонарушениях в свете соблюдения религиозных свобод



Законом Республики Беларусь № 98-З от 28.12.2009 г. внесены некоторые изменения в кодекс и, в частности, это касается части 1 статьи 9.9 Кодекса Республики Беларусь об административных правонарушениях.

Ранее частью 1 ст. 9.9 КоАП РБ была предусмотрена ответственность за создание религиозной организации или руководство ею без государственной регистрации в установленном порядке либо внеуставная деятельность религиозных организаций в виде штрафа в размере от четырех до десяти базовых величин. Согласно изменениям, ответственность наступает за внеуставную деятельность религиозных организаций. Такое правонарушение влечет наложение штрафа в размере от четырех до десяти базовых величин.

Таким образом, в данной части вместо трех составов административных правонарушений остался только один — внеуставная деятельность религиозных организаций. За данное правонарушение к административной ответственности может быть привлечена религиозная организация, то есть юридическое лицо.

О том, что существование административной ответственности за создание религиозной организации или руководство ею без государственной регистрации противоречит Конституции Беларуси, статье 18 Международного пакта о гражданских и политических правах, международным стандартам в области религиозной свободы и ограничивает данное право, юристы, правозащитники, эксперты говорили в течение всего времени существования такой ответственности.

На первый взгляд, исключение из административного кодекса названных составов правонарушений выглядит как позитивная перемена. НО. К сожалению, данное изменение в административном законодательстве не решает проблему законодательного ограничения права на свободу совести и вероисповедания, поскольку по-прежнему действует норма статьи 193–1 Уголовного кодекса Республики Беларусь, которая устанавливает ответственность за организацию деятельности либо участие в деятельности религиозной организации, в отношении которой имеется вступившее в законную силу решение уполномоченного государственного органа о ликвидации или приостановлении деятельности, а также за организацию деятельности или участие в деятельности религиозной организации, не прошедшей в установленном порядке государственную регистрацию (штраф, арест до шести месяцев, лишение свободы до двух лет).

Таким образом, внеся изменение в часть 1 ст. 9.9 КоАП РБ, законодатель просто исправил существовавшую правовую несуразицу, когда за одни и те же действия была предусмотрена и административная, и уголовная ответственность. Так что теперь за деятельность либо участие в деятельности религиозной организации, не зарегистрированной в установленном порядке, гражданин может быть привлечен только к уголовной ответственности. В такой ситуации по-прежнему остается нерешенной проблема необоснованного законодательного ограничения права на свободу вероисповедания (на совместное исповедание религии).

У школах увядуць факультатыў «Асновы праваслаўнай культуры»

Міністэрства адукацыі Беларусі і Беларускі экзархат РПЦ падрыхтавалі праграму факультатыўнага курса «Асновы праваслаўнай культуры. Святыні беларускага народа», паведаміў журналістам міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў.

Паводле міністра, распрацаваная калектывам аўтараў праграма заняткаў факультатыўнага курса прапануецца для вывучэння ў 1—11 класах. У найбліжэйшы час яна будзе накіраваная для разгляду і зацвярджэння ў Нацыянальны інстытут адукацыі.

Аляксандр Радзькоў адзначыў, што гэты факультатыў заснаваны на беларускіх праваслаўных традыцыях.

Акрамя таго, у БДПУ імя М.Танка распрацаваны курс лекцый для студэнтаў і выкладчыкаў ВНУ «Методыка выкладання рэлігіязнаўства ў сярэдняй школе».

Курс прайшоў неабходнае рэцэнзаванне ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы і Інстытуце тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы БДУ.

Польскіх ксяндзоў зноў выганяюць з Беларусі

8 студзеня стала вядома, што Гарадзеншчыну пакінулі два польскія ксяндзы: ім не працягнулі дазвол на працу ў Беларусі. Прычына высылкі ў рашэнні старшыні Дзяржкамітэту па справах рэлігій і нацыянальнасцяў не патлумачана. Астатнім замежным святарам, якія працуюць у Гарадзенскай каталіцкай дыяцэзіі, дазволілі застацца яшчэ на паўгады.



Ксёндз Эдвард Смага вымушана пакінуў вёску Індура Гарадзенскага раёну. Ён вярнуўся ў Польшчу. А вось парафія ў вёсцы Міжэрычы Зэльвенскага раёну пазбаўленая ксяндза. Яна Банькоўскага беларускія ўлады таксама вымусілі вярнуцца ў Польшчу, не працягнуўшы яму дазвол на працу. Адзін з кіраўнікоў Гарадзенскай каталіцкай курыі ксёндз Антоні Ханько паведаміў, што гэтую вёску не пакінуць бяз пастырскай апекі.

«Там праводзіцца служба, хаця ксёндз выехаў, але іншыя абслугоўваюць. У гэтай сітуацыі атрымліваецца адзін ксёндз на чатыры парафіі. Парафіі невялікія, але іх чатыры».

Андрэй Пачобут, журналіст, карэспандэнт польскага выдання «Gazeta Wyborcza», добра ведае айца Яна Банькоўскага, які служыў у касцёле ў Міжэрычах.

«Ён не проста ксёндз, але яшчэ — манах-капуцын. Я з ім размаўляў перад ягоным ад'ездам, яму ніякіх тлумачэнняў не далі. Па сутнасці, чалавека выкінулі. У Міжэрычах гэты чалавек вялікім аўтарытэтам карыстаўся».

Прадстаўнік Гарадзенскай каталіцкай курыі Антоні Ханько зазначае, што апошнія рашэнні беларускіх уладаў значна ўскладнілі працу замежных ксяндзоў на тэрыторыі краіны.

«Усім, хто з'яўляецца замежным грамадзянінам, працягнулі дазвол на працу толькі на паўгады. Такіх ксяндзоў у дыяцэзіі пяцьдзясят чалавек. Раней дазвол давалі на год. Усё па-новаму цяпер: рэгістрацыя і гэтак далей, у два разы больш каштуюць візавыя зборы. Плаціць трэба за дазвол, за страхоўку, за візу, за кожную паперку, больш за паўмільёна за ўсё разам».

Радыё Свабода

Леонид Гуляко: священники должны неукоснительно соблюдать белорусское законодательство



Священники должны неукоснительно соблюдать белорусское законодательство. Об этом 14 января, вскоре после известия о высылке польских священников из Беларуси, заявил Уполномоченный по делам религий и национальностей Республики Беларусь Леонид Гуляко.

Л. Гуляко, в частности, привел факты нарушения законодательства отдельными священнослужителями православной, католической и протестантской конфессий христианства. При этом Уполномоченный подчеркнул, что перед римско-католическими епископами Беларуси неоднократно ставился вопрос о необходимости обеспечить соблюдение приходскими священнослужителями отечественного законодательства.

По словам пресс-секретаря, Гуляко назвал «ощутимой» проблему нехватки священников в приходах Римско-католической церкви в Беларуси. Так, чиновник сообщил, что из 414 католических священников, которые служат в Беларуси, 164 являются иностранцами, в том числе 156 — гражданами Польши.

Гуляко отметил проблему закрепления в приходах молодых священнослужителей, получивших образование в Беларуси. По его словам, не все из 44 человек, которые в последние годы завершили обучение в белорусских католических духовных учебных заведениях и получили отсрочку от службы в армии, вернулись в католические приходы страны.

Уполномоченный обратил внимание на проблему «долгостроя» ряда костелов и сообщил, что региональным структурам аппарата поручено отслеживать выполнение законодательства по выделению новых земельных участков под возведение культовых зданий с учетом объектов незавершенного строительства.

Кроме того, Уполномоченный акцентировал внимание на необходимость активного взаимодействия местных властей с представителями национальных общностей страны и белорусскими соотечественниками за рубежом по реализации в регионах разнообразных экономических и социально-культурных проектов.

БелаПАН

Церковь «Новая Жизнь» обращается к президенту Беларуси



1 марта от имени прихожан церкви «Новая Жизнь» и старшего пастора церкви Вячеслава Гончаренко было направлено письмо на имя президента Республики Беларусь Александра Лукашенко.

Напомним, что в феврале 2009 года чиновники Мингорисполкома выявили следы нефтепродуктов в пробах на проездной части дороги возле здания церкви и зафиксировали это как загрязнение окружающей среды. Территория вокруг церкви ранее использовалась для сельскохозяйственного производства колхозом имени Калинина, а затем на ней размещалась несанкционированная свалка промышленных отходов с остатками автомобильной техники.

В обращении верующих и пастора к руководству страны, в частности, сказано, что «церковь не признает себя виновной в порче земель, так как община не обладает производственными мощностями, эксплуатация которых могла бы нанести столь серьезный вред природе».

Также Вячеслав Гончаренко предложил создать «специальную комиссию по разрешению конфликта между церковью «Новая Жизнь» и властями города Минска с участием представителя президента Республики Беларусь, представителя белорусского офиса Организации по Безопасности и Сотрудничеству в Европе (ОБСЕ), глав протестантских конфессий, правозащитных организаций».

В своем обращении Вячеслав Гончаренко выразил надежду, что конфликт вокруг церкви будет разрешен.

Президенту Республики Беларусь
Лукашенко А. Г.

01 марта 2010 года

Уважаемый Александр Григорьевич!

В связи с применением экономических санкций против Церкви «Новая Жизнь» на общую сумму 271 548 725 рублей якобы за порчу земель нефтепродуктами, мы, верующие церкви, считаем необходимым заявить следующее.

Мы не признаем себя виновными в порче земель, так как церковь не обладает производственными мощностями, эксплуатация которых могла бы нанести столь серьезный вред природе. Напротив, верующие церкви своими руками расчистили несанкционированную свалку, которая находилась на земельном участке на момент его выделения в пользование церкви. Территория была загрязнена мусором, запчастями и кузовами разобранных автомобилей.

Обращаем внимание на то, что проверка, которую проводили сотрудники Минского городского комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды, в том числе отбор проб якобы загрязненной земли с нашей территории, осуществлены с грубейшими процессуальными нарушениями, в том числе норм процессуально-исполнительного кодекса Республики Беларусь об административных правонарушениях, Указа президента Республики Беларусь от 15 ноября 1999г №673.

Мы оставляем за собой право обжаловать в установленном порядке незаконное постановление суда Московского р-на г. Минска, в соответствии с которым Церковь «Новая Жизнь» признана виновной в порче земель, как вынесенное с нарушением действующего законодательства и здравого смысла.

Наша церковь существует на пожертвования, проводит большую работу по оказанию помощи людям, оказавшимся на обочине жизни (алко- и наркозависимым, бездомным, сиротам и вдовам), детским домам, домам интернатам для престарелых и инвалидов, и у нас нет средств для уплаты сумм компенсаций ущерба и штрафа, тем более что решение об их применении вынесено с явным нарушением закона, является неразумным и ничем не оправданным.

Предлагаем образовать специальную комиссию по разрешению конфликта между Церковью «Новая Жизнь» и властями города Минска с участием представителя президента Республики Беларусь, представителя белорусского офиса Организации по Безопасности и Сотрудничеству в Европе (ОБСЕ), глав протестантских конфессий, правозащитных организаций.

Уважаемый господин президент!

Вы — гарант Конституции.

Верующие Церкви «Новая Жизнь» выражают надежду, что конфликт вокруг нашей церкви будет разрешен в строгом соответствии с законами нашей страны и с Божьими законами, законами высшей справедливости, надеемся, что будут обеспечены наши права, гарантированные Конституцией Республики Беларусь.

От имени более 1000 верующих Церкви «Новая Жизнь»,
Епископ Религиозного объединения христиан
полного Евангелия в Республике Беларусь,
Пастор Церкви «Новая Жизнь»
В. Л. Гончаренко
Церковь «Новая Жизнь»

Приговор суда Минского района от 1 февраля 2009 г., судья Минич А.Н.

На основании изложенного, руководствуясь ст.ст. 349-352, 356, 359-361 УПК Республики Беларусь, суд

ПРИГОВОРИЛ:

Михайлова Ивана Владимировича признать виновным в уклонении от мероприятий призыва на воинскую службу и на основании ч. 1 ст. 435 УК Республики Беларусь назначить ему наказание в виде ареста сроком на 3 месяца.

Меру пресечения в отношении Михайлова И.В. до вступления приговора в законную силу оставить прежней – заключение под стражу.

Справа Яна Міхайлава: ці будуць зробленыя высновы?

21-гадовы Ян Міхайлаў адмаўляецца служыць у войску з-за сваіх рэлігійных перакананняў. Яго затрымалі 15 снежня 2009 году і пакаралі арыштам на 3 месяцы.

10 сакавіка Ян Міхайлаў выйшаў на волю і з таго часу знаходзіўся пад падпіскай пра нявыезд.

Ніжэй змешчана копія адказу Канстытуцыйнага Суда РБ, у які звярнулася маці Яна Міхайлава Таццяна.



Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь Сакратарыят

вул. К.Маркса, 32, 220016, г. Мінск
тэл./факс (+375-17) 227 52 09
e-mail: ksrb@kc.gov.by

Конституционный Суд Республики Беларусь Секретариат

ул. К. Маркса, 32, 220016, г. Минск
тел./факс (+375-17) 227 52 09
e-mail: ksrb@kc.gov.by

16.02.2010 № 01-01-03/76

На № ____________ ад ____________

Михайловой Т.Ф.
ул. Кирюникова, 63
223049, д. Щомыслица
Минского р-на
Минской обл.

Уважаемая Татьяна Федоровна!

Статьей 57 Конституции предусмотрено, что защита Республики Беларусь – обязанность и священный долг гражданина Республики Беларусь. Порядок прохождения воинской службы, основания и условия освобождения от воинской службы либо замена ее альтернативной определяются законом.

Позиция Конституционного Суда по вопросу реализации права на замену воинской службы альтернативной службой изложена в решении от 26 мая 2000 г. № Р- 98/2000 «О некоторых вопросах реализации статьи 57 Конституции Республики Беларусь».

В решении Конституционный Суд отметил, что граждане Республики Беларусь в соответствии с Конституцией имеют право, в частности, по религиозным убеждениям на замену воинской службы альтернативной, которое должно быть обеспечено действенным механизмом его реализации. На период до решения на законодательном уровне вопросов об основаниях и условиях замены воинской службы альтернативной и порядке ее прохождения Конституционный Суд согласился, с учетом исключительности обстоятельств, с практикой создания компетентными государственными органами условий для выполнения гражданами Республики Беларусь возложенной на них обязанности по защите Республики Беларусь в тех формах, которые не нарушают их религиозных убеждений.

До настоящего времени вопрос об основаниях и условиях замены воинской службы альтернативной и порядок ее прохождения на законодательном уровне не урегулирован.

15 февраля 2010 г. Конституционный Суд направил в Администрацию Президента Республики Беларусь письмо, в котором отметил необходимость незамедлительной разработки и принятия закона об альтернативной службе.

Первый заместитель
Начальника Секретариата   Л.В.Каравай

Капесва 227 34 61

в. 8738.

Фотарэпартаж з суда над Янам Міхайлавым








Фота Барыса Гарэцкага, Радыё Рацыя.

Справаздача аб захаванні правоў чалавека за 2009 год

Закон гарантуе свабоду веравызнання, аднак на практыцы ўлады абмяжоўвалі гэтае права. Нягледзячы на тое, што Канстытуцыя сцвярджае роўнасць рэлігій і канфесій, яна таксама ўтрымлівае абмежавальныя палажэнні, у адпаведнасці з якімі супрацоўніцтва паміж дзяржавай і рэлігійнымі арганізацыямі «рэгулюецца законам з улікам іх уплыву на фармаванне духоўных, культурных і нацыянальных традыцый беларускага народа».



У 2008 годзе Лукашэнка назваў Беларускую праваслаўную царкву «галоўным ідэолагам краіны», сцвярджаючы пры гэтым, што «мы ніколі не адасаблялі сябе ад царквы». Урад па-ранейшаму выкарыстоўваў абмежавальныя палажэнні рэлігійнага заканадаўства, каб ускладняць ці прадухіляць дзейнасць рэлігійных груп, якія не належаць да Беларускай праваслаўнай царквы (БПЦ). У прыватнасці, закон абмяжоўвае права рэлігійных арганізацый ажыццяўляць рэлігійнае навучанне, патрабуе ад усіх рэлігійных суполак атрымання дазволу дзяржавы на прывоз і распаўсюд літаратуры, а таксама забараняе замежным грамадзянам узначальваць рэлігійныя арганізацыі.

Канкардат і іншыя пагадненні паміж урадам і БПЦ надзяляюць БПЦ прывілеямі, якіх не маюць іншыя рэлігійныя групы. Беларуская праваслаўная царква з'яўляецца экзархатам Рускай праваслаўнай царквы і адзінай афіцыйна прызнанай праваслаўнай дэнамінацыяй у краіне. Усімі рэлігійнымі пытаннямі займаецца апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў (АУСРН) пры Савеце міністраў. Згодна з законам, рэлігійныя арганізацыі павінны прайсці рэгістрацыю ці ў АУСРН, ці ў мясцовых і абласных органах улады. Толькі тыя групы, якія налічваюць не менш як 20 сябраў, могуць зарэгістравацца ў якасці рэлігійных суполак. На працягу года АУСРН адмовіў у рэгістрацыі некаторым нетрадыцыйным рэлігійным групам, што рабіла сходы іх сябраў незаконнымі. Напрыканцы года АУСРН паведаміў пра існаванне 25 афіцыйна зарэгістраваных рэлігійных дэнамінацый, прадстаўленых 3 106 рэлігійнымі суполкамі і 158 рэлігійнымі арганізацыямі.

Упраўленне па справах рэлігій па-ранейшаму адмаўляла ў рэгістрацыі дэнамінацыям, якія лічыла нетрадыцыйнымі, і пераважна гэта тычылася пратэстанцкіх суполак, напрыклад, царквы «Новае Жыццё» і Беларускай Евангельскай царквы. Большасць хрысціянскіх суполак па-ранейшаму выступалі за ўнясенне зменаў у нацыянальнае рэлігійнае заканадаўства, якое абмяжоўвае іх дзейнасць і робіць магчымым крымінальны пераслед за рэлігійныя перакананні.

У пачатку снежня Мінская гарадская пракуратура абвясціла пра аднаўленне крымінальнай справы супраць Яўгена Волкава, якога падазравалі ў дзейнасці ад імя незарэгістраванай арганізацыі, што з'яўляецца парушэннем закона. 30 снежня ўлады абвясцілі, што закрылі справу. Воўкава падазравалі ў тым, што ён прадстаўляе Царкву аб'яднання Муна, якая забароненая ў Беларусі за «дэструктыўную» дзейнасць. Царкве аб'яднання было адмоўлена ў афіцыйнай рэгістрацыі ў Беларусі ў 1996 і 2001 гадах. Паводле закона, выкарыстанне жылой плошчы для набажэнстваў дазваляецца толькі пасля афіцыйнага вывядзення яе з жылога фонду, а гэта значыць, што рэлігійныя арганізацыі былі вымушаныя перарэгістраваць памяшканні, у якіх яны мелі намер праводзіць набажэнствы. Улады па-ранейшаму адмаўлялі ў перарэгістрацыі маёмасці многім пратэстанцкім цэрквам і іншым нетрадыцыйным канфесіям, таму суполкі часта былі вымушаныя сустракацца нелегальна або дома ў каго-небудзь з прыхажан.

У красавіку грэка-каталіцкая суполка ў Мінску беспаспяхова звярнулася да Лукашэнкі па дазвол на будаўніцтва царквы. У жніўні ў Наваполацку мясцовыя ўлады адхілілі просьбу мясцовай суполкі Евангельскай царквы «Благодать» прадаць ёй зямельны ўчастак для будаўніцтва царквы. На працягу года ўрад працягваў пераследаваць «Новае Жыццё» і прыкладаць намаганні, каб высяліць царкву з яе будынка на ўскраіне Мінска. 5 сакавіка надзорная калегія Вярхоўнага гаспадарчага суда пакінула без зменаў рашэнне ад 13 студзеня пазбавіць царкву права ўласнасці на гэты будынак. 16 сакавіка Мінскія гарадскія ўлады прапанавалі царкве ўчастак зямлі памерам адзін акр у іншым месцы, што ў чатыры разы менш таго ўчастка, што належыць царкве, і настойвалі на тым, каб царква прадала сваю маёмасць па цане, ніжэй за рынкавую. УАСРН і Мінскія гарадскія ўлады заявілі, што на месцы царквы неабходна пабудаваць дзіцячы садок або школу. Старэйшы пастар Вячаслаў Ганчарэнка заявіў 8 траўня, што прыход адзінагалосна адхіліў прапанову гарадскіх уладаў.

1 кастрычніка ўлады аштрафавалі Ганчарэнку на 420 000 рублёў (150 даляраў) за непрадастаўленне 9 верасня пажарнай службе магчымасці агледзець храм. 7 кастрычніка Мінскі гарадскі гаспадарчы суд, разгледзеўшы іск мясцовага жыллёвага ведамства, прыняў рашэнне высяліць царкву «Новае Жыццё». 8 снежня надзорная інстанцыя адхіліла апеляцыю, пададзеную царквой. З лістапада 2007 года царква не дазваляе ні адной службовым асобам уваходзіць у свае памяшканні ў адказ на бесперапынныя спробы ўладаў пазбавіць царкву будынка. Закон дазваляе асобам збірацца ў прыватных дамах для малітвы, аднак для правядзення дома рытуалаў, абрадаў ці цырымоній патрэбны дазвол мясцовых уладаў. На працягу года міліцыя некалькі разоў перапыняла рэлігійныя сходы, што праводзіліся ў прыватных дамах, часам арыштоўвала і штрафавала ўдзельнікаў.

За незаконнае правядзенне набажэнстваў баптыстаў, пяцідзесятнікаў ды іншых пратэстантаў штрафавалі ці папярэджвалі па абвінавачаннях у парушэнні грамадскага парадку ці правядзенні несанкцыянаваных сходаў. У снежні розныя СМІ змясцілі паведамленні пра тое, што ў Магілёве абласныя ўлады заклікалі жыхароў інфармаваць ідэалагічных супрацоўнікаў пра незарэгістраваныя рэлігійныя арганізацыі і іх незаконную дзейнасць, у тым ліку пра набажэнствы, распаўсюд літаратуры і місіянерскую дзейнасць.

У лістападзе ў горадзе Асіповічы Магілёўскай вобласці пратэстанцкага актывіста аштрафавалі за правядзенне ў прыватным доме святкавання Дня ўскладання падзякі. Міліцыя ды ідэолагі ўмяшаліся ў святкаванне. 28 кастрычніка ў Гарбавічах улады папярэдзілі 10 прыхажанаў незарэгістраванай царквы «Пасольства Божае», што яны могуць быць прыцягнутыя да адказнасці за правядзенне набажэнства 25 кастрычніка ў прыватным доме. Мясцовыя ідэолагі і міліцыянты ўварваліся ў дом і канфіскавалі рэлігійную літаратуру.

14 ліпеня ў Баранавічах Царква Поўнага Евангелля «Новае пакаленне» была аштрафаваная на 350 000 рублёў (125 даляраў) за правядзенне «незаконнага» набажэнства раніцай у нядзелю 21 чэрвеня. Таксама ў Баранавічах 7 ліпеня суд аштрафаваў двух сябраў мясцовага Савета баптысцкіх цэркваў на 700 000 рублёў (250 даляраў) кожнага за правядзенне малітвы ў прыватным доме. Улады заявілі, што Царква Новага Запавету парушыла рэлігійнае заканадаўства, дазволіўшы Барысу Грысенку, запрошанаму прадстаўніку ўкраінскай месіянскай габрэйскай рэлігійнай арганізацыі, выступіць у царкве 21 траўня. Грысенку аштрафавалі на 105 000 рублёў (35 даляраў) як замежнага грамадзяніна, які прыняў удзел у рэлігійнай дзейнасці, не атрымаўшы на гэта дазволу. Паводле закона, грамадзяне маюць права свабодна гаварыць пра свае рэлігійныя перакананні. Аднак улады па-ранейшаму прадухілялі, спынялі прапаведаванне ад імя любых рэлігійных груп за выключэннем Беларускай праваслаўнай царквы, а таксама каралі асобаў за такія дзеянні.

Урад не дазваляў замежным місіянерам ажыццяўляць рэлігійную дзейнасць па-за рамкамі тых арганізацый, якія іх запрасілі. Закон патрабуе, каб замежныя місіянеры атрымлівалі гадавыя шматразовыя візы для ажыццяўлення «рэлігійнай дзейнасці». Назіральнікі выказвалі занепакоенасць адсутнасцю ўніфікаваных афіцыйных палажэнняў, якія рэгулявалі б прымяненне візавага заканадаўства: гэта ўплывала на ўмовы жыцця і працы місіянераў у краіне. У лютым 2008 года Савет міністраў прыняў дырэктыву, што пералічвае падставы, на якіх замежным рэлігійным дзеячам і рэлігійным дзеячам без грамадзянства можна не дазволіць прыехаць у краіну на запрашэнне мясцовых рэлігійных арганізацый. Сярод такіх прычын і наяўнасць у дакументах дадзеных, што не адпавядаюць рэчаіснасці, і недастатковае веданне расейскай ці беларускай мовы, і здзейсненае раней адміністрацыйнае правапарушэнне ці любая ранейшая адмова ў дазволе на наведванне краіны. Замежныя клерыкі таксама павінны падаваць большую колькасць дакументаў, што робіць працэдуры груваскімі. Закон таксама забараняе заснаванне прадстаўніцтваў замежных арганізацый, чыя дзейнасць скіраваная на распальванне «нацыянальнай, рэлігійнай, расавай варожасці» ці можа «адмоўна ўздзейнічаць на стан фізічнага ці псіхічнага здароўя людзей».

Замежных грамадзян, якія афіцыйна знаходзяцца ў краіне з нерэлігійнымі мэтамі, за ўдзел у рэлігійнай дзейнасці могуць папярэджваць ці высылаць з краіны. На такіх падставах на працягу года выслалі не менш як дваіх чалавек.

Акрамя таго, закон не прадугледжвае вяртання маёмасці, захопленай падчас нацысцкай акупацыі ці за савецкім часам, і абмяжоўвае вяртанне маёмасці, што выкарыстоўваецца ў межах культурніцкай і адукацыйнай дзейнасці. Аднак на працягу года ўлады вярнулі БПЦ шэсць раней канфіскаваных будынкаў і адзін будынак вярнулі яўрэйскай суполцы.

Па стане на канец года, улады так і не выканалі свайго абяцання знайсці новае месца для дзяржаўнага архіва, які захоўваўся ў будынках былога рымакаталіцкага кляштара бернардынаў, што размяшчаецца ў цэнтры Мінска. 15 Ліпеня АУСРН заявіў, што ўлады не могуць вярнуць былы кляштар, таму што няма дзе размясціць дзяржаўныя архівы.

Асобаў, што адмаўляюцца ад вайсковай службы з-за рэлігійных перакананняў, улады пераследавалі і судзілі. 6 лістапада ў Гомелі суд аштрафаваў Змітра Смыка, прыхажаніна мясцовай царквы «Сведак Іеговы», на 3,5 млн. рублёў (1285 даляраў) за ўхіленне ад службы ў войску. Смык прасіў прадаставіць сабе магчымасць прайсці грамадзянскую службу, альтэрнатыўную службе ў войску, у адпаведнасці з палажэннем Канстытуцыі, якое не прымяняецца на практыцы. Пракурор сцвярджаў, што няма ніякіх падставаў, каб вызваліць Смыка ад вайсковай службы з-за яго рэлігійных перакананняў.

Бюро па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і працы Дзяржэпартамента ЗША

Гісторыкі адзначаюць змяненні ў традыцыйнай канфесійнай ідэнтыфікацыі беларусаў у памежных рэгіёнах краіны



У памежных рэгіёнах краіны назіраюцца змяненні ў традыцыйнай канфесійнай ідэнтыфікацыі беларусаў, заявіла 12 лютага доктар гістарычных навук Галіна Каспяровіч на прэзентацыі навукова-папулярнага калектыўнага выдання «Беларусы: сучасныя этнакультурныя працэсы», якое выйшла ў выдавецтве «Беларуская навука» накладам 1 тыс. экземпляраў.

Паводле яе слоў, па выніках даследаванняў, праведзеных у 2007 годзе на мяжы Беларусі з Украінай, Польшчай і Расіяй, выяўлены адыход ад сямейнай рэлігійнай традыцыі. Так, прыкладна 5–6% даследаваных адышлі ад праваслаўя, якое на працягу вякоў дамінавала ў іх сямейным асяроддзі, сказала навукоўца. Матывамі такога адыходу яна лічыць няверʼе ці часам звязаны са шлюбам пераход ў іншую канфесію, у тым ліку ў пратэстантызм. Разам з тым, паводле яе слоў, калі ў Гомельскай вобласці трохі ўзрасла колькасць католікаў, то ў Брэсцкай і Гродзенскай яна крыху знізілася. «Пра гэта трэба задумацца і працягнуць даследаванні», — мяркуе Каспяровіч.

Як адзначыла навукоўца, большасць вернікаў пражывае ў заходніх рэгіёнах краіны. Таксама ўзмацняецца грамадзянская ідэнтычнасць людзей. З кожным годам усё больш грамадзян лічаць сябе беларусамі незалежна ад этнічнага паходжання.

Адна з аўтараў выдання, Аляксандра Гурко, паведаміла, што кніга стваралася навукоўцамі Інстытута этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. На выснове этнаграфічных, палявых, ілюстрацыйных і архіўных матэрыялаў на пачатку 1990-х гадоў пачала выходзіць серыя «Беларусы», якая зараз налічвае 12 тамоў. У серыі прадстаўлены ўсе бакі жыцця нацыі — ад промыслаў і рамёстваў на пачатку засялення беларускіх зямель да кінамастацтва нашага часу.

Новае ілюстраванае выданне прадстаўляе сучасныя этнакультурныя працэсы за апошнія 20 гадоў, у асноўным звязаныя з гісторыяй незалежнай Беларусі. У кнізе раскрываюцца пытанні пахожання беларусаў, сучасных дэмаграфічных працэсаў, сямейных традыцый, дзяржаўных, каляндарных і рэлігійных свят, народнага і прафесійнага мастацтву Беларусі.

Як адзначыла яшчэ адна аўтар выдання Ірына Калачова, на пачатку XXI стагоддзя беларуская гарадская сямʼя захавала уклад сямейнага жыцця з яго старадаўняй традыцыяй вяселля, радзільным абрадам з удзелам хроснага бацькі, а таксама святамі старажытнага народнага каляндара.

Зараз навукоўцы інстытута завяршаюць працу над трохтомнікам «Гісторыя культуры Беларусі».

Марат Гаравы, БелаПАН

Итоги развития этноконфессиональной сферы за 2009 г.



Жировичский монастырь.

Новых религиозных направлений в Беларуси в 2009 году не зарегистрировано. Об этом сообщил Уполномоченный по делам религий и национальностей Леонид Гуляко на заседании коллегии по итогам развития этноконфессиональной сферы в минувшем году.

По словам Леонида Гуляко, «в Беларуси продолжает возрастать роль традиционных конфессий». В 2009 году увеличилось значение взаимодействия белорусского государства и ведущих религиозных конфессий в укреплении не только стабильности общества, но и в обеспечении престижного имиджа Беларуси на международной арене как страны, в которой обеспечено плодотворное сосуществование различных религиозных и этнических групп, отметил Уполномоченный.

По данным аппарата Уполномоченного, на 1 января 2010 года в Беларуси действовало 25 зарегистрированных религиозных направлений, включающих 3 263 религиозные организации. В 2009 году в стране появилось 47 новых религиозных общин и 3 общины самоликвидировались. Ведущей конфессией страны остается Белорусская православная церковь, «которую многие считают духовным лидером в белорусском обществе», констатировал Леонид Гуляко. На 1 января 2010 года в БПЦ действовало 1509 общин, в том числе 36 новых приходов появилось в минувшем году. За год завершено строительство и реконструкция 41 культового православного здания. Обеспеченность православных приходов храмами сегодня составляет 87%. В Беларуси действует 31 православный монастырь, 14 братств, 9 сестричеств и 5 духовных учебных заведений.

Уполномоченный напомнил, что в 2009 году свыше Br1 млрд. было выделено из госбюджета на оплату труда преподавателей и обучение студентов духовных учебных заведений. Кроме того, в минувшем году на реставрацию Минской духовной академии и Минской духовной семинарии (в Жировичах) было выделено более Br7 млрд. бюджетных средств, причем все деньги были освоены. На строительство Минского духовно-образовательного центра в 2009 году выделено более Br4 млрд.

Леонид Гуляко констатировал возрастание роли Римско-католической церкви в общественной жизни Беларуси и в укреплении многовекторности внешней политики. На 1 января 2010 года в стране действовало 470 католических общин, в том числе было зарегистрировано 3 новые общины, а также 1 новый монастырь в Витебске.

Он также отметил положительную тенденцию активизации диалога религиозных структур с местными органами власти Беларуси. «Практика показывает, что многие вопросы, которые поднимаются религиозными организациями, можно успешно решать на местном уровне. Этому способствует проведение разъяснительной работы местных властей, встречи руководителей местных органов власти с религиозными лидерами, — подчеркнул Уполномоченный. — Следует развивать и прививать эту практику и далее»

БЕЛТА

Бюлетэнь «За свабоднае веравызнанне» Bulletin of «For free Denomination»
№ 25, January — March 2010.
Наклад 299 экземпляраў.
Паштовы адрас: 220012, а/с 101, Мінск, Беларусь.
E-mail: religionfreedom@tut.by
www.forreligiousfreedom.info
Тэл. (+375 17) 282–42–10.

В вузах запретят партии и религиозные организации

В палате представителей разрабатывается новый проект Кодекса об образовании.

Председатель комиссии по образованию, культуре, науке и научно-техническому прогрессу нижней палаты парламента Владимир Зданович, выступая 23 февраля на расширенном заседании комиссии, заявил, что проект Кодекса об образовании содержит запрет на деятельность в вузах политических партий и религиозных организаций.

«Высшее образование в Беларуси будет оставаться светским», — сказал он.

Вместе с тем, Зданович напомнил, что в БГУ действует Институт теологии имени святых Мефодия и Кирилла. «Нам надо будет или закрыть на это глаза, или прописать о нем в кодексе отдельной строкой», — сказал он. Проект Кодекса об образовании готовится в палате представителей к рассмотрению во втором чтении.

Напомним, что на заседании 11 декабря 2009 года депутаты палаты представителей приняли во втором чтении законопроект «О статусе военнослужащих». Законопроект запрещает военнослужащим срочной службы участвовать в деятельности политических партий и общественных объединений, преследующих политические цели. Граждане, призываемые на службу, должны будут приостановить свое членство в таких организациях.

Законопроект дает право военнослужащим в свободное от выполнения обязанностей военной службы время участвовать в собраниях, митингах, уличных шествиях и иных массовых мероприятий, проводимых в соответствии с законодательством вне территории воинской части.

В то же время, участие военнослужащих в забастовках, а также иное неисполнение обязанностей военной службы в целях урегулирования вопросов, связанных с ее прохождением, документ запрещает.

БелаПАН